**Акулёнак, Л.** Вярталі ў строй верталёты / Л. Акулёнак // Зара (Бешанковічы). — 2008. — 15 лют. — С. 2.

## ВЯРТАЛІ Ў СТРОЙ ВЕРТАЛЁТЫ



Дэмабілізаваўшыся ў запас пасля двух гадоў тэрміновай службы ў войсках сувязі, Мікалай Дашкевіч прыехаў да бацькоў у Чырвоныя Буднікі. Пазней уладкаваўся на працу на адзін з заводаў горада Віцебска.

Праз год Мікалай вырашыў вярнуцца ва Узброеныя Сілы. Прайшоў спецыяльную падрыхтоўку, атрымаў ваенную спецыяльнасць і ў званні прапаршчыка прыбыў для праходжання службы ў авіяцыйны полк, які размяшчаўся на ўскраіне Віцебска.

Дашкевіч паспяхова выконваў абавязкі механіка па абслугоўванні самалётаў, тэхніка-механіка па самалётах і рухавіках.

Асобнай старонкай у службовай біяграфіі Мікалая значыцца Афганістан. Авіяцыйны полк, у якім ён служыў, у снежні 1979 года прымаў удзел у дастаўцы савецкіх войск у паўднёвую краіну. Транспартныя самалёты з Віцебска перавозілі ў Кабул бранятэхніку, дэсантныя падраздзяленні.

Паспяховаму правядзенню транспартных аперацый спрыяла добра наладжанае тэхнічнае абслугоўванне самалётаў на зямлі, да чаго меў непасрэднае дачыненне і наш зямляк. На аэрадромах Афганістана, дзе базіраваліся самалёты і верталёты, старана неслі службу і падраздзяленні абслугоўваючага тэхнічнага персаналу.

У складзе аднаго з такіх падраздзяленняў з ліпеня 1986 года паспяхова выконваў баявую задачу і Мікалай Дашкевіч. На аэрадроме Джэлалабад у той час базіраваліся баявыя верталёты. Адны з іх, напрыклад, «Мі-8», забяспечвалі транспарціроўку дэсантных войск спецыяльнага прызначэння ў вызначаныя раёны. А «Мі-24» агнём сваіх ракет, гармат і кулямётаў падтрымлівалі наземныя войскі ў час правядзення імі баявых аперацый.

Вайна не бывае без ахвяр, таму не заўсёды вярталіся на базу экіпажы верталётаў пасля выканання баявых аперацый. Толькі за адзін год лётны полк, які абслугоўвала падраздзяленне, дзе служыў Мікалай Дашкевіч, страціў 10 верталётаў і 20 членаў экіпажаў. Многія машыны вярталіся на аэрадром моцна пашкоджанымі. Задача тэхнікаў была хутчэй вярнуць іх у баявы строй. І з ёй яны спраўляліся паспяхова. У начны час авіяспецыялісты рамантавалі пашкоджаныя вузлы, «залечвалі» раны на фюзеляжах верталётаў, каб раніцай машыны былі гатовы да чарговых

палётаў.

Часам рамонтныя работы спыняў абстрэл аэрадрома варожымі зенітнымі комплексамі. Душманам вельмі не падабалася наша баявая тэхніка, і яны час ад часу рабілі спробы знішчыць яе на зямлі.

Праз год і два месяцы падраздзяленне, у якім служыў прапаршчык Дашкевіч, вярнулася з Афганістана ў Віцебск.

За службу ў Афганістане Мікалай адзначаны медалём «За баявыя заслугі» і медалём урада Афганістана.

Роўна 25 гадоў з гонарам выконваў Мікалай Канстанцінавіч Дашкевіч грамадзянскі абавязак абаронцы Радзімы. Пясля дэмабілізацыі былы авіятар пераехаў жыць у бацькоўскі дом у вёску Чырвоныя Буднікі, займаецца хатняй гаспадаркай. Дзень вываду савецкіх войск з Афганістана – і яго свята. Мікалай Канстанцінавіч унёс свой уклад у яго набліжэнне...

**Л. Акулёнак**